# Падарожжа па краіне “Мовазнавіі”: лінгвістычны турнір

**Н. І. Куратнік,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
вышэйшай катэгорыі
гімназіі № 2 г. Пінска

**Мэты**: паглыбіць веды вучняў па раздзелах “Фанетыка”, “Графіка і арфаграфія”, “Лексіка і фразеалогія”; садзейнічаць развіццю лагічнага мыслення школьнікаў, фарміраванню ўмення калектыўна шукаць адказ на пастаўленае пытанне; павышаць цікавасць да вывучэння роднай мовы.

**Абсталяванне:** выказванні беларускіх пісьменнікаў пра мову, рэбусы, малюнкі фразеалагізмаў, назвы “станцый” падарожжа.

## Ход мерапрыемства

***Чытанне вучнем верша Я. Янішчыц “Мова”***

Чую тваю жаўруковую музыку
У скошаных травах мурожных.
Мова! Як сонца маё беларускае,
Ты свецішся словам кожным.
Цябе і заворвалі, і закопвалі,
І ўсё ж нашы продкі праз гора
Данеслі да нас цябе,
родную, цёплую,
Жывую і непаўторную.
І калі ты мяне толькі паклічаш,
Памру за цябе без енку.
Нашу я любоў да цябе вялікую
У сэрцы сваім маленькім.

**Уступнае слова настаўніка.** Мы рады вітаць усіх удзельнікаў і гасцей нашага сённяшняга мерапрыемства, якое прысвеча роднай беларускай мове: мілагучнай, як песня, яркай, як сонца, ласкавай, як маці. Так пра родную мову сказала наша зямлячка, паэтэса Яўгенія Янішчыц.

Многія беларускія паэты ў сваіх творах апявалі неўміручую родную мову. Даваўце паслухаем гэтыя цудоўныя радкі.

***Чытанне вучнямі выказванняў пра мову***

Родная мова,
Цудоўная мова!
Ты нашых думак
Уток і аснова!

*Уладзімір Дубоўка*

Гэтай ісціне веру даўно,
І яна для мяне як замова:
У людзей ёсць багацце адно –
Чалавечае  добрае слова.

*Сяргей Законнікаў*

Мова…
Родная мова
У марах, у песнях, у снах.
Мае ў ёй кожнае слова
Свой колер, і смак, і пах.

*Анатоль Грачанікаў*

Мова продкаў нашых і нашчадкаў –
Шэпт дубровы і пчаліны звон, -
Нам цябе ласкава і ашчадна
Спазнаваць ажно да скону дзён…

*Генадзь Бураўкін*

**Настаўнік.** Наша сённяшняе мерапрыемства будзе яшчэ адным крокам да пазнання таямніц мовы.

**(*Прадстаўленне каманд*)**

**Настаўнік.** Падвесці вынікі конкурсу і выявіць лепшага знаўцу мовы нам дапаможа шаноўнае журы.

**(*Прадстаўленне журы*).**

**Першы тур “Запрашаем у падарожжа”**

***Конкурс “Назаві каманду”.*** Членам каманд неабходна купіць “білет” для падарожжа. **Умова**. З набору літар скласці слова, якое будзе з’яўляцца назвай каманды. (*За выкананне задання першая каманда атрымлівае 3 балы, другая – 2, трэцяя – 1*).

**(Магчымыя назвы каманд:** “Акацыя”, “Буслік”, “Ветразь”).

***Конкурс “Размінка”***

**Умова.** Каманды па чарзе адказваюць на пытанні, кожны правільны адказ – 1 бал.

1. Якое слова складаецца з 7 гукаў, а паказвае на 32 літары? (Алфавіт)
2. Назву якога насякомага ўтварае паўтарэнне 1 літары? (Цэ-цэ)
3. Які падоўжаны гук абазначаецца трыма літарамі? (ддз)

4. Як слова метрапалітэн запісаць пяццю літарамі? (Метро)
5. Які часопіс можна знайсці ў лесе? (Вожык)
6. Які часопіс можна ўбачыць пасля дажджу? (Вясёлка)
7. Якую частку слова знойдзеш у зямлі? (Корань)
8. Якія займеннікі псуюць дарогі? (Ямы)
9. Назва якога дрэва складаецца з 3 аднолькавых зычных і галосных гукаў? (Баабаб)

**Другі тур "Станцыя" Фанетыка"**

**Настаўнік.** Неспрыяльныя ўмовы надвор'я перашкаджаюць прачытаць назву першай станцыі нашага падарожжа, зрабіць гэта дапамогуць наступныя словы:

Я вельмі важная навука,

Тлумачу ўтварэнне гука.

***Конкурс "Бліц-турнір"***

**Умова.** Каманды па чарзе адказваюць на пастаўленыя пытанні. Пры адсутнасці адказу або памылцы каманды права адказу пераходзіць да іх балельшчыкаў. (Правільны адказ каманды – 1 бал, адказ балельшчыкаў – 0,5 бала).

1. Колькі ў беларускай мове галосных гукаў? (6)
2. Якая літара не абазначе гука? (Ь)
3. Гукі мовы, пры вымаўленні якіх паветра свабодна праходзіць праз поласць рота. (Галосныя)
4. Вымаўленне аднаго са складоў слова з большай сілай голасу і працягласцю. (Націск)
5. Знайдзі памылку: гук [з] зычны, звонкі, цвёрды, *шыпячы.*
6. Знайдзі памылку: гук [л] зычны, *мяккі,* звонкі.
7. Пазнай гук: заўсёды зычны, мяккі, звонкі. [ Й]
8. Знайдзі памылку: гук [н] зычны, *глухі,* цвёрды.
9. Знайдзі памылку: гук [к] зычны, *звонкі*, цвёрды.

***Гульня "Пільнае вока"***

**Колькі разоў паўтараюцца зацвярдзелыя гукі ў наступнай скарагаворцы:** Ішоў грэка цераз рэку, бачыць грэка ў рацэ – рак; грэка руку ўсунуў у рэку, рак за руку грэка цап! 17

**Колькі разоў паўтараецца гук [ а] у наступнай скарагаворцы:** Каля ямы з кіямі, з кіямі каля ямы. (8)

**Колькі разоў паўтараецца гук [ дз] у наступнай скарагаворцы:** Дзяды і дзядзькі дзялілі дзялянкі. (4)

**(Правільны адказ – 3 балы)**

***Конкурс для балельшчакаў “Загадкі-жарты”***

**1.** Што мы чуем у пачатку ўрока? (Гук [**ў**])

**2.** Што знаходзіцца пасярэдзіне зямлі? (Гук [**м**])

**3.** Чаго няма ў цыбулі і бульбе, але ёсць у моркве і бураках? (Гук [**р**])

**Трэці тур “Станцыя “Графіка”**

Пазнаць наступную станцыю дапаможа правіла: раздзел навукі пра мову, які вывучае суадносіны паміж літарамі і гукамі. (Графіка)

***Конкурс “Збяры слова”***

**Умова.** З дадзенага набору літар утварыць і запісаць назвы свойскіх жывёл і спартыўных гульняў.

***Янінсв, аабска, чкаева; ігбэр, оалп, астьблра, лотуфб.*** (Свіння, сабака, авечка; рэгбі, пола, стральба, футбол).

***Конкурс для балельшчыкаў.*** **Умова.** Адгадайце вершаваную загадку Ул. Мацвеенкі.

Літара,
Як глянеш вочкам,
Быццам
Мяккі знак з кіёчкам.
Здагадаліся,
Сябры?
Ну, канечне ж,
Гэта − ….Ы.

***Гульня “Веру – не веру”***

**Ы** – 28 літара беларускага алфавіта. (Так)

Паходзіць з кірыліцкай літары “еры”. (Так).

Раней абазначала зычны гук. (Не).

На сённяшні дзень існуе толькі ў беларускім алфавіце (Не).

Не можа стаяць у пачатку слова. (Так)

***Конкурс “Бліц-турнір”***

1. Колькі літар у беларускім алфавіце? (32)
2. Стваральнікі азбукі, на аснове якой узнік беларускі алфавіт. (Браты Кірыла і Мяфодзій)
3. Якой літары беларускага алфавіту пастаўлены помнік? (Ў)
4. Колькі літар беларускага алфавіту выкарыстоўваецца для абазначэння галосных гукаў? (10)
5. Якія літары ёсць у рускім алфавіце, але адсутнічаюць у беларускім? (ъ, щ)
6. Якая літара ёсць у беларускім алфавіце, але адсутнічае ў рускім? (ў)

***Конкурс для балельшчыкаў “Разгадай рэбус”***

**Чацвёрты тур “Станцыя “Арфаграфія”**

З Арфаграфіяй сябруйце
І старання не шкадуйце!

***Гульня “Пільнае вока”***

**Умова.** Знайдзіце памылкі ў наступных прыказках і прымаўках і выпраўце іх. (Кожная выпраўленая памылка – 0,5 бала).

1. Прігожая птушка перьем, а челавек вученем.
2. Не аткладвай на заутра тое, што мошна зрабіць сёня.
3. Сем разоу атмерай, адін раз атрэш.

***Конкурс для балельшчыкаў “Самыя, самыя…”***

1. Самай вялікай азбукай лічыцца азбука Кампучыі . Колькі ў ёй літар? (72 літары).
2. Самы кароткі нацыянальны гімн у Іарданіі. Колькі ў ім слоў? (4)
3. Самае кароткае пісьмо напісаў французскі пісьменнік В. Гюго. Ён хацеў даведацца, як прадаецца яго твор. У пісьме не было ніякіх слоў, а толькі адзін пунктуацыйны знак – пытальнік. Пісьменніку адказалі пісьмом таксама толькі з адным знакам. Якім і чаму? (Клічнікам, які абазначаў, што твор прадаецца цудоўна).

**Пяты тур “Станцыя “Лексіка”**

***Конкурс для каманд “Узнаві верш”***

**Умова.** З даведкі падабраць па адным прыметніку, які па сэнсе падыходзіць да кожнага паэтычнага радка.

Цёплыя словы – сонца і хата.
Лепшыя словы – мама і тата.
Смачныя словы – хлеб і суніцы,
Росныя словы – кветкі, крыніца.
Чулыя словы – сын, калыханка,
Ясныя словы – лета і ранак.
Мудрыя словы – жыта і поле,
Светлыя словы – вецер і воля.
Даўнія словы – водгулле, род.
Гордыя словы – звон і народ.

*Таццяна Мушынская*

***Конкурс для балельшчыкаў “Пазнай слова”***

1. Слова гэта не новае. Яно ўжывалася яшчэ тады, калі не ведалі ні футбола, ні хакея, ні воднага пола. Толькі раней яно мела значэнне “сторож гарадскіх, крапасных варот”. (Варатар)

2. У старажытнасці гэтае слова мела значэнне “купец”. (Госць)

3. Слова паходзіць ад старажытна рускага “реку” – гавару. (Урок)

4. Гэтым словам старажытныя рымляне называлі сузор’е Малога пса. Гэтак жа яны называлі і той перыяд, калі сонца знаходзілася ў названым сузор’і. (з 22 ліпеня па 23 жніўня). Гэтыя дні прыпадалі на самую гарачую пару лета, таму ў занятках аб’яўляўся перапынак. Адсюль і назва слова. (Канікулы)

5. Гэтае слова паходзіць з латыні, дзе мае значэнне “клубень”, “цыбуліна”. (Бульба)

6. Пазнайце слова, якое паходзіць ад спалучэння двух лацінскіх слоў, Якія ў перакладзе на беларускую мову маюць значэнне “хуткая нага” (Веласіпед)

***Конкурс “Запазычаныя словы”.*** **Умова:** замяніць запазычаныя словы беларускімі адпаведнікамі:

Арфагафія – правапіс.

Дыялог – размова

Хаос – беспарадак

Аргумент – доказ

Ваяж – падарожжа

Бар’ер – перашкода

Аналогія – падабенства

Кантраст – процілегласць

Каментарый – тлумачэнне

Фантазія – уяўленне

Фрагмент – урывак

Гігант – веліікан

Антракт – перапынак

***Конкурс капітанаў.*** **Умова:** запісаць як можна больш слоў з часткай фон.

***Конкурс для балельшчыкаў “Антонімы”***

**Умова:** прадоўжыце прыказкі, каб у другой частцы быў антонім да аднаго са слоў першай часткі.

Аднаму густа, а… (другому пуста).

Калі б маладосць ведала, а … (старасць магла).

Лепш адзін раз убачыць, чым … (сто разоў пачуць).

Левая рука не ведае, што … (робіць правая).

Не зведаўшы гора, … (шчасця не пазнаеш).

Вялікі целам, ды … (малы дзелам).

Рыхтуй сані летам, а … (калёсы зімой).

Лета збірае, а … (зіма з’ядае).

***Конкурс “Фразеалагізмы”***

**Пакажы фразеалагізм. Умова:** 2 прадстаўнікі каманды з дапамогай мімікі і жэстаў паказваюць фразеалагізм, каманды яго пазнаюць і тлумачаць значэнне. (Каманда правільна пазнае фразеалагізм – 1 бал, правільна тлумачыць значэнне – 2 балы).

*За нос вадзіць. Дрыжаць, як асінавы ліст. Вакол пальца абвесці. На адной назе. Хадзіць на задніх лапках. Задзіраць нос.*

***Конкурс для балельшчыкаў “Замяні фразеалагізм адным словам”***

Вады ў рот набраць – маўчаць.

Таўчыся пад нагамі – перашкаджаць.

Ні свет ні зара – рана.

Збіцца з панталыку – памыліцца.

Вады ў рот набраць – маўчаць.

Не знаходзіць сабе месца – хвалявацца.

Зубы на паліцу класці – галадаць.

На сваіх дваіх – пешшу.

Хоць вока выкалі – цёмна.

Рукой падаць – блізка.

Як гром сярод яснага неба – нечакана.

Хоць іголкі збірай – ясна.

***Падвядзенне вынікаў.***

**Заключнае слова настаўніка.** Закончыць наш конкурс хочацца наступным пажаданнем удзельнікам і гледачам. Каб на уроках беларускай мовы яны ніколі не працавалі спусціўшы рукавы, не вешалі нос і не апускалі рукі, калі нешта не атрымліваецца, і не задзіралі нос, атрымаўшы 10, уважліва слухалі настаўніка, ніколі на ўроку не лічылі варон і не клявалі носам, заўсёды памяталі аб тым, што іх чакае непачаты край новага і невядомага.